…12. архіўному отделу. Н.КВД.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б)Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№ 45 (65) Панядзелак, 29 кастрычніка 1945 г. Цана 15 кап.

БРЕСТ ОБЛАСТ

## Дастойна сустрэнем 28-ю гадавіну Кастрычніка

Набліжаецца вялікі гістарычны дзень—28 я гадавіна Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі. Уся краіна рыхтуецца дастойна сустрэць сваё нацыянальнае свята, адзначыць яго новымі дасягненнямі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

28-ю гадавіну Кастрычніка працоўныя нашай Радзімы сустракаюць ва ўмовах нябачаных гістарычных перамог над гітлераўскай Германіяй і японскімі імперыялістамі. Гэту слаўную гадавіну мы сустракаем ва ўмовах напружанай працы па аднаўленню гарадоў, сёл, прамысловасці, транспарта і сельскай гаспадаркі, разбураных нямецка-фашысцкімі варварамі.

Працоўныя нашага раёна прыходзяць да 28 й гадавіны вялікага Кастрычніка са значнымі перамогамі ў абласці аднаўлення разбуранай гаспадаркі. Аднак раён адстае ў завяршэнні хлебанарыхтовак і ў выкананні плана нарыхтовак бульбы. На 27 кастрычніка план хлебанарыхтовак выканан на 97 проц а нарыхтовак бульбы на 57 проц Значна адстаюць у гэтай справе такія сельсоветы як Яглевіцкі, Альбінскі, Белавіцкі і Альшанікі.

Не зусім добра абстаіць справа з выкананнем фінансавага плана ў раёне.

Для таго, каб дастойна сустрэць 28-ю гадавіну Кастрычніка, у раёне неабходна яшчэ шырэй разгарнуць прадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва за хутчэйшае завяршэнне хлебанарыхтовак і выкананне плана нарыхтоўкі бульбы дзяржаве. Мы маем усе магчымасці ў бліжэйшыя дні не толькі выканаць, але і перавыканаць план хлебанарыхтовак, а да свята поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па здачы бульбы. Няма больш пачотнай задачы для партыйных, савецкіх і камсамольскіх работнікаў, старшынь сельсаветаў, працоўных сялян і сялянак, як па бальшэвіцкі закончыць здачу хлеба і бульбы дзяржаве і сустрэць вялікае свята стопрацэнтным выкананнем плана нарыхтовак усіх сельгаспрадуктаў.

Па ініцыятыве сялян Бусяжскага і Грыўдзенскага сельсоветаў у раёне распачалася добраахвотная здача хлеба ў фонд Перамогі. Гэту ініцыятыву трэба ўсямерна падтрымаць, і на аснове шырокай растлумачальнай работы ўцягнуць ў дабравольную здачу хлеба ў чэсць надыходзячага свята шырокія масы сялян.

**Працоўныя раёна! Мы стаім напярэдадні вялікага нацыянальнага свята савецкага народа. Вы шэй сцяг прадкастрычніцкага сацыялістычнага спаборніцтва! Новымі вытворчымі перамогамі на заводах, поўным выкананнем плана здачы хлеба, бульбы і другіх сельгаспрадуктаў дзяржаве дастойна сустрэнем 28-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі!**

## Рыхтуюцца да свята

Актыўна рыхтуюцца да 28-й гадавіны Кастрычніка вучні Яглевіцкай пачатковай школы. Пад кіраўніцтвам сваіх настаўнікаў т.т. Марозавай і Хараўчук яны рыхтуюць рад мастацкіх нумароў, з якімі выступяць у святочныя дні. У прыватнасці вучні развучваюць п'есу, рад песень і дэкламацый, а таксама некалькі індывідуальных і групавых танцаў.

Павысілася паспяховасць і дысцыпліна вучняў. Кожны з іх стараецца сустрэць вялікае свята савецкага народа з добрымі і выдатнымі паказчыкамі ў вучобе.

## КАЛГАС „ПЕРАМОГА“

Пераканаўшыся, што адзіна правільнай сістэмай вядзення сельскай гаспадаркі з'яўляецца калгасная сістэма, сяляне вёскі Сакоўцы Бусяжскага сельсовета аб'ядналіся ў калгас. Нязарганізаванаму калгасу прысвоена імя „Перамога“.

**Нядаўна адбыўся агульны сход калгаснікаў, на якім было выбрана праўленне калгаса. У склад праўлення выбраны актывісты вёскі калгаснікі Пестрак Александр Сямёнавіч, Дземідовіч Ілля Рыгоравіч і Барысік Кандрат Міхайлавіч. Старшынёй праўлення выбран Пестрак Александр Сямёнавіч.**

**Калгасу адведзена лепшая зямля. На пад'ёме зябі ўжо працуе трактар Івацэвіцкай МТС. Калгаснікі прыступілі да абарудавання калгаснага двара і канюшні.**

## ШЭФСТВА НАД КАЛГАСАМ „ПЕРАМОГА“

Упраўленне дарожна-будаўнічага раёна № 4 (ДСР-4), дзе начальнікам т. Будняк, па ўласнай ініцыятыве ўзяло шэфства над калгасам „Перамога“ Бусяжскага сельсовета. Мэта шэфства—аказанне калгасу практычнай арганізацыйнай і эканамічнай дапамогі.

27 кастрычніка шэфы наведалі калгас.

## Утварэнне выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і ў Совет Нацыянальнасцей

На падставе артыкулаў 34 і 35 Канстытуцыі СССР і артыкулаў 24, 25, 26 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР» Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 16 кастрычніка г. г. створана 656 выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і 631 выбарчая акруга па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

(ТАСС).

# У СОЎНАРКОМЕ БЕЛАРУСКАЙ ССР

У мэтах палепшання гандлю і абслугоўвання насельніцтва ў передсвяточныя і святочныя дні 28-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, Совет Народных Камісараў Беларускай ССР пастанавіў:

Палепшыць гандаль і абслугоўванне насельніцтва ў перадсвяточныя і святочныя дні, забяспечыўшы атаварванне прадуктовых картак за кастрычнік месяц і часткова за лістапад. Выпусціць у гандлёвую сетку прадукты і іншыя тавары палепшанай якасці і пашыранага асартыменту. У гарадах рэспублікі арганізаваць калгасныя і сялянскія кірмашы. Для сустрэчнага гандлю для калгаснікаў і сялян выпусціць тавараў шырспажыву на 3 500 тысяч рублёў.

* * *

Соўнарком Беларускай ССР устанавіў тэрміны палявання ў асенне-зімовы сезон 1945—46 г.г. ва ўсіх паляўнічых угоддзях Беларускай ССР за выключэннем запаведнікаў і прыпісных паляўнічых гаспадарак. Тэрміны палявання устаноўлены на вавёрку, куніцу, выдру, норку, гарнастая, тхара, зайца-беляка з 1 лістапада 1945 г. па 15 студзеня 1946 года. Паляваць на зайца-русака дазволена з 1 лістапада 1945 года па 1 лютага 1946 года, на дзікую свінню і барсука з 25 кастрычніка гэтага года па 1 лютага 1946 года, на ваўка—круглы год.

(БЕЛТА).

## Дапамагаюць школе

Сялянін вёскі Міхнавічы Стайкаўскага сельсовета Белы Аляксандр першым у вёсцы разлічыўся з дзяржавай па здачы хлеба і бульбы.

З'яўляючыся членам бацькаўскага камітэта ён разам з сялянінам Туркіневічам Александрам арганізаваў нарыхтоўку і вывазку дроў для школы. Зараз школа на цэлы год забяспечана палівам.

А. Валасевіч

# ХЛЕБ І БУЛЬБА—ДЗЯРЖАВЕ

## Выканалі план хлебанарыхтовак

Сяляне Сенькавіцкага, Яблонскага, Бусяжскага і Стайкаўскага сельсоветаў поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па здачы хлеба. На 26 кастрычніка гэтага года план хлебанарыхтовак выканан: у Сенькавіцкім сельсовеце на 111 процантаў, Яблонскім—102, Бусяжскім—101, Стайкаўскім—100 процантаў.

Зараз, уключыўшыся ў прадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, сяляне гэтых сельсоветаў здаюць хлеб дзяржаве звыш плана ў фонд Перамогі.

## У фонд Перамогі

У чэсць надыходзячага свята—28-й гадавіны Кастрычніка—у раёне разгарнулася масавая дабравольная здача хлеба звыш плана ў фонд Перамогі. Сяляне Любішчыцкага сельсовета здалі ў фонд Перамогі звыш 20 тон хлеба, Бусяжскага сельсовета звыш 7 тон, Стайкаўскага 7,4 тоны, Белавіцкага 6,4 тон. Хлеб у фонд Перамогі паступае і з другіх сельсоветаў. Усяго па раёну паступіла звыш 68 тон.

Актыўны ўдзел у дабравольнай здачы хлеба ў фонд Перамогі прымаюць сяляне-льготнікі.

## Выканалі першую запаведзь

Сяляне вёскі Яглевічы Яглевіцкага сельсовета выканалі сваю першую запаведзь—поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па здачы хлеба і бульбы. Імкнучыся дастойна сустрэць 28-ю гадавіну Кастрычніка, сяляне распачалі дабравольную здачу хлеба ў фонд Перамогі.

Ужо здана звыш 2-х тон хлеба. (наш кар.)

## Вёска Бараны выканала план хлебанарыхтовак

Сяляне вёскі Бараны Яблонскага сельсовета, уключыўшыся ў прадкастрычніцкае спаборніцтва, завяршылі здачу хлеба дзяржаве, а таксама на 100 процантаў выканалі план бульбанарыхтовак.

Зараз сяляне і сялянкі вёскі здаюць бульбу звыш плана ў фонд Перамогі. Мультан Валенціна здала ў фонд Перамогі 200 кілаграм бульбы. Такую-ж колькасць здаў і сялянін Фіранчук Іван.

## ЗВОДКА

**хода выканання плана нарыхтоўкі бульбы на 27 кастрычніка 1945 г.**

| Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|
| 1 Івацэвіцкі | 100 |
| 2 Яблонскі | 100 |
| 3 Стайкаўскі | 98 |
| 4 Косаўскі | 75 |
| 5 Сенькавіцкі | 72 |
| 6 Яглевіцкі | 67 |
| 7 Любішчыцкі | 60 |
| 8 Гошчаўскі | 59 |
| 9 Падстарынскі | 60 |
| 10 Жытлінскі | 53 |
| 11 Белавіцкі | 54 |
| 12 Грыўдзенскі | 52 |
| 13 Бусяжскі | 46 |
| 14 Альшаніцкі | 39 |
| 51 Альбінскі | 37 |
| Усяго па раёну | 57 |

## ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ

У нарыхтоўках бульбы дзяржаве значна адстаюць Грыўдзенскі, Альбінскі, Бусяжскі і Альшаніцкі сельсоветы. План здачы бульбы ў гэтых сельсоветах на 26 кастрычніка выканан усяго на 37-52 процантаў.

Выканаўчыя камітэты гэтых сельсоветаў і ўпаўнаважаныя райкома і райвыканкома павінны прыняць дзейсныя меры і ў бліжэйшыя дні ліквідаваць адставанне ў справе нарыхтоўкі бульбы.

У гэтых сельсоветах ёсць усе магчымасці выйсці ў перадавыя. Трэба шырэй разгарнуць прадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, дабіваючыся датэрміновага выканання плана.